***Рэдзько І. І.****, бібліятэкар Дзеравянчыцкага яслі-сада − пачатковай школы Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці*

# Гаворым і чытаем па-беларуску

## Інтэрактыўная гульня для ІІІ−ІV класаў

***Мэта:*** фарміраваць цікавасць і павагу да беларускай мовы.

***Задачы:***

- развіваць інтэлектуальныя здольнасці;
- выхоўваць уменне ўзаемадзейнічаць у працэсе пазнавальнай дзейнасці;
- садзейнічаць развіццю камунікатыўных навыкаў вучняў, творчага мыслення, пазнавальнага інтарэсу, узбагачэнню слоўнікавага запасу**.**

***Абсталяванне:*** словы прымавак, кветачкі з бумагі, гербы розных гардоў і Слоніма.

**Вядучая.** Бедны той, хто не мае скарбаў вечных — скарбаў душы. Такі скарб, які ніхто і ніколі адабраць у нас не здолее, — гэта любоў да Бацькаўшчыны, да свайго народа, да роднай мовы. Родная мова — гэта душа народа. Пакуль жыве мова, жыве і народ. «Родная мова, цудоўная мова» — так ласкава пісаў паэт Уладзімір Дубоўка.

Сёння мы правядзём інтэрактыўную гульню сярод вучняў ІІІ−ІV класаў «Чытаем і размаўляем па-беларуску». Удзельнічаць у гульні будуць дзве каманды: Рамонак і Валошка. Напачатку хачу агучыць правілы гульні: за кожны правільны адказ вы будзеце атрымліваць кветачку; калі каманда будзе гатова, неабходна пазваніць ў чароўны званочак; калі адна з каманд не мае адказу, другая можа адказваць і зарабіць сабе кветачку.

Пажадаем удзельнікам поспехаў!

**1. Казачная тэрапія «З рога ўсяго многа».**

***Адгадайце загадкі.***

1. Ідуць з хаты — вельмі рады,

А калі вяртаюцца,

Слязамі абліваюцца. *(Вёдры.)*

1. Ляжыць, не ходзіць,

А сама ўсіх водзіць. *(Сцежка.)*

3. Еду, еду — ні дарогі, ні следу. *(Лодка.)*

4. Скручана, звязана, на кол насаджана, па вуліцы скача. *(Мятла.)*

***Назавіце казкі.***

1. Жыла-была муха-пяюха. Мела яна каляску і шэсць камароў. Запрэгла муха-пяюха камароў у каляску ды паехала на пагулянку. Едзе яна дарогаю, едзе шырокаю — бяжыць мышка:

— Добры дзень, пані! Як цябе зваць-велічаць?

— Я муха-пяюха. А ты хто?

— А я па паліцах скрабатуха.

— Сядай, паедзем разам. *(«Муха-пяюха».)*

2. Жыў дзед з бабай. Былі яны вельмі бедныя: ні насіць няма чаго, ні варыць.

Вось баба і кажа дзеду:

— Вазьмі, дзеду, тапарок, паедзь у лясок, ссячы дубок, завязі на рынак, прадай і купі гарчык мукі. Спячом хлеб.

Сабраўся дзед, паехаў у лясок, пачаў секчы дубок... *(«Каток — залаты лабок».)*

**2. «Таямнічая скрынка».**

Вядучая ўносіць чорную скрынку.

**Вядучая.** Адгадайце, што ў скрынцы.

1. Зубастыя, а не кусаюцца. *(Граблі.)*

2. У маленькім гаршчочку смачная каша, ды зачэрпнуць цяжка. *(Арэх.)*

3. Вярхом сядаю, на каго — не знаю, знаёмага ўбачу, адразу саскочу. *(Шапка.)*

4. Як вазьму цябе ў руку, трапна б'еш ты па цвіку. *(Малаток.)*

**3. Вясёлы перапынак «Верш у кішэні».**

**Вядучая.** А зараз я прапаную трошкі перадыхнуць і паслухаць вучняў, якія дома рыхтавалі выразнае чытанне вершаў пра беларускую мову, Радзіму.

**4. Конкурс-інтэрактыў «Мудрыя дарадцы роднай мовы».**

**Вядучая.** Я збіралася пачытаць вам прыказкі. Склала ў мяшок патрэбныя словы і пайшла. А мех быў дзіравы — словы павысыпаліся. Так і ляжаць на дарозе. Дапамажыце мне скласці з іх прыказкі.

Удзельнікі складаюць прыказкі са словы, якія напісаны на лістках.

Птушка, выпусціў, як, вернеш, слова, не *(Слова, як птушка: выпусціў — не вернеш.)*

Грошы, за, купішь, пряцеля, не. *(Прыяцеля за грошы не купіш.)*

Пачуешь, паменш, кажы, пабольш. *(Паменш кажы, пабольш пачуеш.)*

Пасцелька, родная, як, зморанаму, зямелька. *(Родная зямелька — як зморанаму пасцелька.)*

І, на, чужыне, загіне, камар. *(На чужыне і камар загіне.)*

Падумай, потым, спярша, скажы. *(Спярша падумай, потым скажы.)*

***Фізкультмінутка «Літаратурная аптэка».***

**Вядучая.** Бывае так, што добрае слова лечыць лепш, чым лекі. Я прапаную ўдзельнікам сказаць адзін аднаму што-небудзь прыемнае, добрае.

**5. Піяр-акцыя «Літаратурнае дрэва».**

**Вядучая.** Паважаныя ўдзельнікі гульні, я бачу, што вы ведаеце родную мову, карыстаецеся ёю. Але мне вельмі цікава, што ж вы любіце чытаць на беларускай мове. Я раздам вам лісточкі, на іх напісаны творы беларускіх

пісменнікаў. Вы павінны выбраць тыя творы, якія вы любіце чытаць. Потым вашымі лісточкамі мы ўпрыгожым наша дрэўца.

**6. Гульня «Сход знаўцаў беларускай мовы».**

**Вядучая.** Паважаныя ўдзельнікі, вам будуць прапанаваны чатыры намінацыі: мова, прырода, Радзіма, горад Слонім. Выбіраючы намінацыю, вы выбіраеце пытанне па гэтай тэме.

***Мова.***

1. Колькі літар у беларускім алфавіце? *(32.)*

2. Ці ёсць у беларускай мове літара **ъ**? *(Няма, замест яе пішацца апостраф.)*

***Прырода.***

1. Які звер з'яўляецца сімвалам Беларусі? *(Зубр.)*

2. Як называецца рака, якая працякае ў Слоніме? *(Шчара.)*

***Радзіма.***

1. Колькі абласцей на Беларусі і якія? *(Шэсць: Мінская, Брэсцкая, Гродзенская, Віцебская, Гомельская, Магілёўская.)*

2. Хто з'яўляецца першадрукаром Беларусі? *(Францыск Скарына.)*

**Горад Слонім.**

1. Сярод прапанаваных знайдзіце герб Слоніма (вывешваюцца на дошку). *(3.)*



2. Чаму на танку, змешчаным ў цэнтры горада Слоніма, намаляваны лік 107? *(Горад вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў 10 ліпеня.)*

**7. «Букет роднай мовы».**

**Вядучая.** Вось і закончылася наша гульня. Вы цудоўна гулялі і паказалі сябе знаўцамі беларуская мовы. А зараз я прапаную ўсім удзельнікам інтэрактыўнай гульні скласці букет роднай мовы з кветачак, атрыманых за правільныя адказы.

**Радзімаю нашай край гэты завецца**

На свеце існуе такая краіна,
Дзе хвоі ажно дастаюць аблачыны,
Дзе рэкі, азёры ў суседстве з лясамі
Напоўнены салаўёў галасамі.
У гэтай краіне ўзгоркі, раўніны
Улетку пакрыты густой зелянінай.
Ляночак цвіце з небам сінім у згодзе.
Тут песні і казкі з легендамі ходзяць.
Сяброў дарагіх запрашаюць у госці.
Тут людзі не схільныя крыўдзіць кагосьці.
У гэтай краіне ля хатаў буслянкі,
А ў хатах пяшчотна гучаць калыханкі.
Радзімаю нашай край гэты завецца.
Хай нашай Радзіме шчасліва жывецца!

*Васіль Жуковіч*

***Спіс выкарыстаных крыніц***

1. Жуковіч, В. Радзімаю нашай край гэты завецца [Электронный ресурс] / В. Жуковіч. — Режим доступа: https://voprosy.by/vasil-zhukovich-radzimayu-nashaj-kraj-gety-zavetstsa. — Дата доступа: 15.02.2022.

2. Программа для учреждений общего среднего образования с белорусским и русским языками обучения «Основы информационной культуры»

(I−IX классы) // Зборнік нарматыўных дакументаў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. — 2008. — № 13. — С. 66−80.